# Новинки книг

| | |
|---|---|
|  | Бондаренко, В. За други своя. Герои и подвиги Беларуси / Вячеслав Бондаренко. – Минск : Беларусь, 2022. – 176 с.: ил.<br>*Книга В. Бондаренко посвящена героям. Мужественные, самоотверженные люди, любившие Отечество больше собственной жизни, они прославили белорусскую землю далеко за ее пределами или навсегда соединили с ней судьбу...*<br>*Каждый из героев книги совершил высокое деяние, имя которому – Подвиг во славу Родины.* |
|  | Бутэвіч, А. Распасажаны дом : аповесці / Анатоль Бутэвіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. – 292 с.<br>*Ці ўдаецца чалавеку супраціўляцца абставінам? Ці хапае духоўнай і фізічнай сілы, настойлівасці і жыццёвай мудрасці перайначыць іх на сваю карысць? Што важней: знарок забыцца на ўсё перажытае, хутчэй выкінуць з памяці, засяродзіцца ў самім сабе, ці не адрывацца ад людзей, разам, сумесна таптаць дарогу ў заўтрашні дзень для сваіх дзяцей?*<br>*Гэтым жывуць героі кнігі. Аповесць "Апошняе ігрышча" – пра жыхароў хутара Язавец, што на Нясвіжчыне ў былой Заходняй Беларусі. Яны яшчэ не ведаюць, што чакае іх пасля 17 верасня 1939 года, калі Савецкая Армія сваім вызваленчым паходам з'яднае беларускія землі ў адну дзяржаву. Не здагадваюцца, як складзецца іхні лёс пасля "добраахвотнага" ўступлення ў калгас і такога ж "добраахвотнага" перасялення з хутара. Пра гэта ўжо аповесць "Распасажаны дом, або Хутарская вольніца".* |
|  | Вайна-трагедыя і памяць народа : расказваюць сведкі падзей: зб. дыялект. тэкстаў / уклад. В. М. Курцова, Л. П. Кунцэвіч, Т. М. Трухан. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 514 с.<br>*Содержание этой книги составляют тексты-воспоминания, в которых восстанавливается прошлое. Прошлое, связанное с Великой Отечественной войной. Сборник диалектных текстов является ретроспективной передачей памятных событий, сохранившихся в сознании рассказчиков как часть их впечатлений, накопленных в трагическое время или услышанных от своих отцов, дедов. Все увиденное, пережитое в тот период – оно очень личное, неповторимое и тем самым уникальное. Собранные в книге воспоминания – это не только личные воспоминания, это коллективная, общенародная, всенародная память, ставшая исторической памятью белорусов.* |

| | |
|---|---|
|  | Вайна. Юнацтва. Подзвіг [зборнік твораў: для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту] / маст. Я. У. Шэвякоў. – Мінск : Народная асвета, 2020. – 142 с.<br>*У зборнік уключаны творы аб юнаках і дзяўчатах, чыё сталенне прыйшлося на жудасны ваенны час.*<br>*У кнізе дзве часткі: у першай У. В. Вавула дае хранікальна-дакументальныя звесткі аб юных героях Беларусі, у другой увазе чытачоў прадстаўлены паэмы вядомага беларускага пісьменніка Міколы Чарняўскага, прысвечаныя подзвігам юных змагароў за сваю Радзіму.* |
|  | Глобус, Адам. Сям'я: раман / Глобус Адам. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. – 158 с.<br>*Новую кнігу сучаснага беларускага літаратара Адама Глобуса склалі найлепшыя словы, напісаныя ім за апошнія гады. Найлепшыя, бо пісаліся яны пра самае дарагое, каштоўнае і важнае, што мае кожны чалавек: пра маці і бацьку, пра брата і сваякоў, пра жонку, дачку, унука. Кніга «Сям'я» пра крэўных і блізкіх, пра родных і любімых. Пісьменнік у ёй дакладны, гіперрэалістычны і шчыры. «Шануй бацьку свайго і маці сваю, каб падоўжыліся дні твае на зямлі…» Так напісана ў біблейскай кнізе «Выхад». Пра гэта ж апавядаецца і ў кнізе Глобуса «Сям'я».* |
|  | Грунтоў, С. У. Фатаграфія і культура памяці ў беларусаў у другой палове XIX-пачатку XXI ст. / С. У. Грунтоў. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 188 с.: іл.<br>*У манаграфіі прасочваюцца і аналізуюцца сувязі паміж фатаграфіяй і культурай захавання і трансляцыі памяці ў беларусаў. Фотапартрэты і сямейныя фатаграфіі разглядаюцца праз прызму сучасных гуманітарных тэорый памяці. Асобная ўвага надаецца вывучэнню фотаздымкаў у вясковых інтэр'ерах. У кнізе прадстаўлены ўсе асноўныя перыяды з'яўлення, росквіту і заняпаду традыцыі пахавальнай фатаграфіі ў беларусаў; рэканструяваны раннія этапы гісторыі надмагільнай фатаграфіі і прасочаны візуальныя крыніцы са збораў беларускіх музеяў, прыватных калекцый, а таксама сабраных аўтарам палявых этнаграфічных матэрыялаў.* |

| | |
|---|---|
|  | Купала, Я., Колас, Я. Бацькоўскі дар : зборнік твораў Янкі Купалы і Якуба Коласа. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2022. – 326 с.: іл.<br>*У кнігу ўвайшлі творы народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы («Спадчына», «Курган») і Якуба Коласа («Новая зямля»).*<br>*Выданне падрыхтавана ў межах сацыяльна-творчага праекта «Сямейнае чытанне» сумесна з грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз жанчын» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.*<br>*У кнізе прадстаўлены фатаграфіі родных мясцін – вытокаў жыцця і творчасці песняроў беларускага народа Янкі Купалы і Якуба Коласа.* |
|  | Мы жылі у буднях барацьбы: старонкі ваенных дзеннікаў беларускіх пісьменнікаў / уклад. Г. Запартыка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2020. – 365 с.<br>*У выданні ўпершыню пад адной вокладкай друкуюцца дзённікі чатырох беларускіх пісьменнікаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Выключнасць кожнага ў тым, што яны адлюстроўваюць падзеі на розных ваенных напрамках, з'яўляюцца свое- асаблівым геаграфічным ці тапанамічным паказнікам вялікіх шляхоў Перамогі.*<br>*Мікола Лобан – удзельнік баёў на Ленінградскім фронце, быў двойчы паранены. Антон Алешка Вялікую Айчынную вайну прайшоў франтавым урачом, спачатку на Заходнім фронце, а потым на 3-м Беларускім. Дзённік Пятра Валкадаева раскрывае гераічныя і трагічныя старонкі партызанскага руху на Магілёўшчыне. Запісы Вісарыёна Гарбука адлюстроўваюць падзеі 1941-1945 гг., звязаныя з абаронай Масквы, вызваленнем Беларусі, Полышчы, узяццем Берліна.* |
|  | Помним их имена: для детей средн. и старш. шк. возраста : составитель Юдчиц Т. С. – Минск : Народная асвета, 2020. – 103 с.<br>*В книге собраны материалы о жизни и подвигах героев военных лет, защищавших Родину от врага, именами которых названы учреждения образования, улицы населенных пунктов Беларуси.* |




Сахута, Я. М. Беларуская выцінанка: традыцыі і сучаснасць / Я. Сахута. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 318 с.: іл.

*Выданне прысвечана арыгінальнаму, цікаваму, калісьці даволі пашыранаму, затым практычна забытаму, а сёння адроджанаму на новым ўзроўні віду народнай творчасці - мастацкаму выразанню з паперы. Адразіўшыся ў наш час фактычна з небыцця, выцінанка (выразка, выстрыганка) за кароткі перыяд заявіла пра сябе як адметны мастацкі феномен; яна з'яўляецца кампанентам ці суб'ектам разнастайных выставак, фестываляў, святаў, конкурсаў, ёю займаюцца ў дзіцячых садках, школах, студыях, дамах і цэнтрах рамёстваў, нават у вышэйшых навучальных установах. У 2021 г. беларуская выцінанка ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.*

*У прапануемым выданні разглядаюцца і асвятляюцца гісторыя, сучасны стан, мастацкія асаблівасці, еўрапейскі кантэкст, нацыянальная адметнасць беларускай выцінанкі.*




Сенненскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна: зб. навук. арт. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут гісторыі; уклад. А. В. Бараноўскі; рэдкал.: В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2023. – 335 с.

*Зборнік навуковых артыкулаў уключае матэрыялы, прысвечаныя праблемам палітычнай, сацыяльнай, эканамічнай і культурнай гісторыі Сенненшчыны, якія прайшлі апрабацыю на навукова-практычнай канферэнцыі "Сенненскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна", што адбылася ў ліпені 2022 г. у г. Сянно Віцебскай вобласці.*




Традыцыйны светалад Беларусаў. У 5 кн. Кн.1. касмалогія / уклад. І. М. Дубянецкая., С.І. Санько. – Мінск : Беларуская навука, 2023. – 318 с.: іл.

*У першай кнізе серыі з пяці ілюстраваных кніг, прысвечаных ключавым тэмам, вобразам і канцэптам традыцыйнага светапогляду беларусаў, гаворка ізде пра ўяўленні аб паходжанні і будове Сусвету, структуры жыццёвай прасторы чалавечай супольнасці, пра кругабег часу.*

| | |
|---|---|
|  | Цень зоркі : 25 апавяданняў маладых празаікаў / уклад. Юлія Алейчанка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. – 270 с.<br>*Зборнік склалі апавяданні дваццаці пяці маладых беларускіх празаікаў: як пачынаючых, так і тых, хто ўжо зрабіў упэўненыя крокі ў літаратуры. Фантастычны свет, свет чалавечых пачуццяў і ўзаемаадносін, сучаснасці і гістарычнага мінулага – абсяг тэм кнігі вельмі шырокі. Разнастайная і палітра аўтарскіх стыляў: ад следавання класічным канонам да мадэрновага, падкрэслена сучаснага гучання.* |
|  | Шніп, В. А. Заўтра была адліга-3: дзеннікавы раман паэта / Віктар Шніп. – Мінск : Звязда, 2023. – 272 с.<br>*"Заўтра была адліга – 3" – працяг дзённікавага рамана, з папярэднімі часткамі якога чытач пазнаёміўся праз кнігі Віктара Шніпа "Пугачоўскі цырульнік" (2013), "Заўтра была адліга" (2015), "Трава бясконцасці" (2018) і "Заўтра была адліга – 2" (2022). Дык пра што ж кніга? Калі коратка – пра штодзённасць, якую ўсе мы пражываем, часта не заўважаючы надзвычай важнага. Аўтар не толькі заўважыў, але і занатаваў яркія моманты з быцця сваіх родных і блізкіх, нечаканыя факты з біяграфій вядомых людзей, мітрэнгі рэдактарскай працы, вандроўкі ў снах і наяве, а таксама вершы, якія нечакана прыдумаліся ў дарозе. І ўсё гэта разам сплялося ў цікавую празаічна-паэтычную гісторыю, чытаючы якую можна і засмяяцца, і заплакаць, і задумацца.* |